ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 12 (932) | АЎТОРАК, 16 верасня 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## АБ ПАМЕРАХ СТЫПЕНДЫІ

З 1-га верасня на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 жніўня 1997 года N1124 устаноўлены дзяржаўныя стыпендыі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

Імянныя стыпендыі зацверджаны ў памеры 780 тыс. руб.

Вучэбныя стыпендыі па выніках сесіі для студэнтаў гуманітарных, эканамічных і педагагічных спецыяльнасцей пры балах: ад 3,6 да 4,0 -- 400 тыс.руб., ад 4,0 да 4,5 -- 440 тыс. руб., ад 4,5 да 5,0 -- 520 тыс. руб., пры 5,0 -- 600 тыс. руб; для студэнтаў прыродазнаўча-навуковых і тэхнічных спецыяльнасцей пры балах: ад 3,4 да 4,0 --400 тыс.руб., ад 4,0 да 4,5 -- 480 тыс.руб., ад 4,5 да 5,0 -- 560 тыс.руб., пры 5,0 -- 640 тыс.руб.

Персанальная стыпендыя Савета ВНУ складае 520 тыс. руб., сацыяльная стыпендыя -- 320 тыс. руб.

Для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апякунства бацькоў і знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні , стыпендыя выплачваецца ў памеры 250 тыс. руб.

## ПРЫЗНАННЕ ВЫСОКАГА АЎТАРЫТЭТУ

У канцы жніўня-пачатку верасня наступнага года ў г.Кракаве (Польшча) будзе праходзіць XII Міжнародны з'езд славістаў. Як паведаміў намеснік старшыні Беларускага камітэта славістаў Г.А.Цыхун, у праграму гэтага з'езда ўключаны два даклады ад нашага універсітэта, што з'яўляецца прызнаннем яго высокага аўтарытэту. Аўтары дакладаў -- прафесар кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнка і загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства дацэнт У.І.Коваль.

## ПРЫСВЕЧАНЫЯ ЮБІЛЕЮ ВУЧОНАГА-ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦЫ

5-га верасня ў Вялікай канферэнц-зале Інстытута гісторыі НАН Беларусі адбыліся юбілейныя навуковыя чытанні, прысвечаныя 70-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага вучонага-літаратуразнаўцы і пісьменніка А.М.Адамовіча. Удзел у гэтых чытаннях ад нашага універсітэта прынялі загадчык кафедры беларускай літаратуры прафесар І.Ф.Штэйнер, дактарантка В.К.Шынкарэнка, якія выступілі з дакладамі, і аспірант названай кафедры С.І.Ханеня.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

***За шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць, вялікі асабісты ўклад у развіццё вышэйшай школы і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння першы прарэктар нашага універсітэта прафесар СЕЛЬКІН Міхаіл Васільевіч узнагароджаны Граматай Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта.***

***За шматгадовую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры гісторыі ўсходнеславянскіх народаў дацэнт РУБАН Анатоль Аляксеевіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.***

## АДУКАЦЫЯ

### НАБЫЎ СТАТУТ УНІВЕРСІТЭТА

Усе былыя дзяржаўныя педагагічныя інстытуты абласных цэнтраў Беларусі ўжо пераўтвораны ва універсітэты. Апошнім гэты высокі статус з новага навучальнага года набыў Магілёўскі pедінстытут імя А.Куляшова.

### РЫХТУЮЦЬ КАДРЫ ДЛЯ МЕТАЛУРГАЎ

Сярод шасці ВНУ Гомельшчыны першым адкрыў свой філіял політэхнічны інстытут. Сёлета ён створаны ў Жлобіне на базе Беларускага металургічнага завода. Іменна для гэтага гіганта айчыннай металургіі будуць рыхтавацца высокакваліфікаваныя кадры патрэбных спецыяльнасцей.

### ФІЛІЯЛ БДЭУ Ў БАБРУЙСКУ

У горадзе на Бярэзіне адкрыты філіял Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта. Яго прызначэнне -- рыхтаваць кадры эканамістаў рознага профілю ў асноўным для Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

### АДКРЫТЫ Ў БАРАНАВІЧАХ

У гэтым раённым цэнтры з бягучага навучальнага года пачаў працаваць філіял Беларускай політэхнічнай акадэміі. Яго першымі студэнтамі сталі 80 юнакоў і дзяўчат.

У гэтым жа другім па значнасці горадзе Брэстчыны адкрылася і сярэдняя спецыяльная школа міліцыі.

### КОЖНЫ СЁМЫ -- ВУЧАНЬ

У новым навучальным годзе гасцінна расчынілі свае дзверы 755 школ нашай вобласці. За парты села амаль 242 тыс. вучняў. Гэта -- кожны сёмы жыхар Гомельшчыны.

### ПРАФЕСІЯ ДЛЯ МУЖНЫХ

Яшчэ на адну сярэднюю спецыяльную ўстанову прыбавілася ў нашым горадзе. На базе былога вучэбнага цэнтра УУС аблвыканкома (у Лешчынцы) адкрыта пажарная школа. Прафесію мужных тут пачалі набываць звыш ста юнакоў.

## З універсітэцкага "Дня ведаў"






# "МЫ -- СТУДЭНТЫ!"

Пачуцці радасці і хвалявання перапаўнялі душу кожнага першакурсніка, хто прыйшоў 1-га верасня на універсітэцкую святочную ўрачыстасць -- Дзень ведаў. Ім яшчэ не верылася, што цяпер яны знаходзяцца ўжо ў зусім іншай якасці: школьнае дзяцінства засталося ззаду, а наперадзе -- свет студэнцтва -- неспазнаны, таямнічы. Адкрываць яго нясмелым навічкам будуць выкладчыкі ГДУ на працягу пяці гадоў.

Само надвор'е першай верасвеўскай раніцы стварала і віноўнікам урачыстасці, і ўсім яе ўдзельнікам -- кіраўніцтву універсітэта, дэканам факультэтаў, выкладчыкам, супрацоўнікам адпаведны выдатны настрой.

З самымі цёплымі словамі віншаванняў, пажаданняў звярталіся да папаўнення студэнцкай сям'і ГДУ рэктар доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі Л.А.Шамяткоў, старшыня абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкі, прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін А.С.Калугін, сакратар камітэта Беларускага патрыятычнага саюза моладзі універсітэта Андрэй Гарбачоў. Першакурснікі даведаліся аб выдатных традыцыях Гомельскага дзяржаўнага універсітэта -- вядучай вышэйшай навучальнай установы рэгіёна, якая з гонарам носіць імя слаўнага сына нашага народа, першага беларускага друкара і асветніка Францыска Скарыны. І вучыцца тут сёлетнім першакурснікам -- ганарова і адказна, ім садзейнічаць росквіту і славе роднага універсітэта, берагчы і памнажаць слаўныя традыцыі сваёй ВНУ ў вучэбнай і навуковай дзейнасці, грамадскім жыцці, спорце і мастацтве. А як знакі прыналежнасці да дружнай студэнцкай сям'і ГДУ ўручылі першакурснікам сімвалічныя студэнцкі білет і ключ ведаў.

Сёлетнім першакурснікам давядзецца заканчваць вучобу ўжо ў наступным, XXI стагоддзі. Ім ствараць і будаваць новае жыццё, больш дастойнае і па-сапраўднаму светлае. А для гэтага -- патрэбны веды, глыбокія, трывалыя. Першы універсітэцкі званок паклікаў юнакоў і дзяўчат у аўдыторыі на першую лекцыю, у краіну студэнцтва.

Поспехаў вам, дарагія першакурснікі, у добры шлях!

**(Наш кар.)**

**На здымках:** ***сімвалічны студэнцкі білет у першакурснікаў Марыны Пятрэнка з гісторыка-юрыдычнага факультэта і Сяргея Байкова, які стаў студэнтам факультэта фізічнай культуры; першакурснік эканамічнага факультэта Аляксей Кульбакоў з ключом ведаў; першы універсітэцкі званок даюць студэнтка I курса філалагічнага факультэта Марына Селязнёва і пяцікурснік гісторыка-юрыдычнага факультэта Андрэй Фацін.***

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**



## ДЛЯ НОВЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

У сувязі з заканчэннем падрыхтоўкі спецыялістаў па эканоміцы і сацыялогіі працы і спыненнем набору на гэтую спецыяльнасць ва універсітэце перастала існаваць аднайменная кафедра. Замест яе адкрыта кафедра камерцыйнай дзейнасці і фінансаў, якую ўзначальвае к.э.н., дацэнт Р.Я.Кобрынскі. Яна будзе выпускаючай для адкрытых сёлета на эканамічным факультэце дзвюх новых спецыяльнасцей -- камерцыйная дзейнасць; фінансы і крэдыт.



*НАВУКА*

# САБРАЛІСЯ ФІЗІКІ РОЗНЫХ КРАІН

У адной з маляўнічых мясцін Гомельшчыны -- пансіянаце ВБА "Гомельпрамбуд" "Залатыя пяскі" сёлета с 8 па 17 жніўня працавала Міжнародная школа-семінар па актуальных праблемах фізікі часціц. Гэта чацвёртая міжнародная школа, якая была праведзена на Гомельшчыне. Тры першыя паспяхова адбыліся ў 1971, 1973 і 1977 гадах, г.зн. чарговая школа-семінар прайшла праз 20 гадоў. Ініцыятыва ў правядзенні і арганізацыі чатырох Міжнародных школ звязана з імёнамі вядомых вучоных і неардынарных асоб, такіх, як М.М.Багалюбаў, Ф.І.Фёдараў, У.Г.Кадышэўскі, У.А.Белы, Б.В.Бокуць і іх вучняў.

Вялікая работа па арганізацыі і правядзенню сёлетней школы-семінара была праведзена пад кіраўніцтвам члена аргкамітэта, рэктара універстэта члена-карэспандэнта НАН Беларусі Л.А.Шамяткова.

Аператыўна вырашаліся пытанні ў час работы школы прарэктарамі М.В.Селькіным, Д.Р.Лінам, У.М.Палевіковым, а таксама начальнікам аддзела ТСН М.П.Сахно. Плённа працавалі пры правядзенні школы супрацоўнікі кафедры тэарэтычнай фізікі В.В.Андрэеў, А.М.Дзеружкова, Т.А.Алфёрава і іншыя.

Арганізатарамі школы-семінара 1997 года "Актўальныя праблемы фізікі часціц" былі Аб'яднаны інстытут ядзерных даследаванняў (АІЯД), Нацыянальны Цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій (НЦФЧВЭ), Інстытут фізікі НАН Беларусі, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, Інстытут механікі металапалімерных сістэм імя У.А.Белага НАН Беларусі, Гомельскі політэхнічны інстытут імя П.О.Сухога.

Навуковая праграма школы была насычана навукаёмістымі лекцыямі і семінарамі па фізіцы і тэхніцы паскаральнікаў, рэлятывісцкай ядзернай фізіцы і сучаснай квантавай тэорыі поля. Асаблівая ўвага была ўдзелена фізіцы на новых паскаральніках, а таксама тэарэтычнаму і эксперыментальнаму статусу фундаментальных узаемадзеянняў пры высокіх энергіях. Лекцыі і даклады былі прадстаўлены вучонымі як навуковых цэнтраў -- арганізатараў школы, так і сусветна вядомых навуковых цэнтраў ЗША, Германіі, Швейцарыі, Францыі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі і шэрагу краін СНД.

Аб высокім навуковым рэйтынгу Гомельскіх школ сведчыць той факт, што адзін з лектараў школы 1977 года прафесар Карла Рубіа (Гарвардскі універсітэт і CERN) праз некалькі гадоў атрымаў Нобелеўскую прэмію па фізіцы.

У час работы школы-семінара ўдзельнікі змаглі ў шчырых абставінах абмеркаваць важныя навуковыя праблемы з вядучымі вучонымі прыярытэтных напрамкаў тэарэтычнай і эксперыментальнай фізікі высокіх энергій.

Традыцыйнае правядзенне Міжнародных школ на Гомельшчыне не выпадковае. Перш за ўсё гэта звязана з навуковым патэнцыялам Рэспублікі Беларусь і, у прыватнасці, Гомельшчыны.

У навуковую праграму сучаснай школы былі ўключаны лекцыя В.В.Андрэева і аўтара гэтых радкоў, а таксама стэндавыя даклады В.М.Дзеружковай, Т.А.Алфёравай і В.М.Капшая. Змест гэтых навуковых выступленняў выклікаў вялікую цікавасць сярод слухачоў школы. Сам факт удзелу супрацоўнікаў кафедры тэарэтычнай фізікі ў рабоце Міжнароднай школы сведчыць аб высокім узроўні навуковых даследаванняў, якія праводзяцца на кафедры.

Правядзенне такіх школ садзейнічае развіццю вучэбнай і навуковай актыўнасці ў галіне фізікі высокіх энергій на Гомельшчыне.

У час работы школ ствараюцца вельмі спрыяльныя ўмовы для ўстанаўлення асабістых кантактаў з выдатнымі айчыннымі і замежнымі спецыялістамі, з прадстаўнікамі многіх навуковых цэнтраў. Як паказаў вопыт трох папярэдніх Гомельскіх школ, такія кантакты непазбежна перарастаюць у канкрэтныя формы цеснага супрацоўніцтва. Прыкладам можа служыць заключэнне доўгатэрміновых дагавораў аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж АІЯД, НДІЯФ МДУ, ІФ НАН Беларусі, НЦФЧВЭ, ГДУ і ГПІ.

Дзякуючы гэтым дагаворам, пачынаючы з 1973 года для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне фізікі высокіх энергій з ГДУ ў філіял НДІЯФ МДУ ў Дубне былі пераведзены студэнты і накіраваны на навуковую стажыроўку выкладчыкі універсітэта. Вядучыя выкладчыкі кафедры тэарэтычнай фізікі ГДУ, кафедр вышэйшай матэматыкі і агульнай фізікі ГПІ прынялі актыўны ўдзел у сумесных навуковых даследаваннях з супрацоўнікамі лабараторыі ядзерных праблем АІЯД і ІФ НАН Беларусі, з супрацоўнікамі НЦФЧВЭ.

Ва універсітэце і політэхнічным інстытуце г.Гомеля быў створаны рад навуковых падраздзяленняў па фізіцы высокіх энергій. Намаганнямі супрацоўнікаў ІФ НАН Беларусі і кафедры тэарэтычнай фізікі ў ГДУ распрацаваны і ўкаранёны ў вучэбны працэс спецкурсы па выкарыстанню ЭВМ пры рашэнні задач фізікі высокіх энергій. Студэнты-старшакурснікі актыўна ўключаюцца ў навуковыя даследаванні, эфектыўна пачынае працаваць аспірантура па дадзенаму навуковаму напрамку.

На кафедры тэарэтычнай фізікі ГДУ поруч са спецыялізацыяй "тэарэтычная фізіка" былі створаны ўмовы для адкрыцця спецыялізацыі "камп'ютэрнае мадэліраванне фізічных працэсаў". Арыентацыя гэтых дзвюх спецыялізацый на фізіку высокіх энергій павысіла попыт на маладых спецыялістаў.

**М.МАКСІМЕНКА,**
**доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі.**

## НА РАДЗІМЕ БЕЛАРУСКАГА ПЕРШАДРУКАРА

Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф.Скарыны пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь праводзіў 9-12 верасня г.г. у Полацку трэція "Скарынаўскія чытанні". Сёлета яны прысвячаліся 480-годдзю беларускага кнігадрукавання.

Ад нашага універсітэта ў традыцыйных чытаннях прынялі ўдзел прафесар кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнка і загадчык музея Ф.Скарыны К.С.Усовіч. Яны, а таксама прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце ГДУ М.М.Воінаў і загадчык кафедры гісторыі беларускай культуры Д.Д.Паўлавец з'яўляюцца аўтарамі дакладаў, якія былі ўключаны ў праграму прайшоўшых чытанняў.

Інтэрв"ю

# "БУДЗЕМ ЗАЙМАЦЦА АБАРОНАЙ І ПРАБЛЕМАМІ МОЛАДЗІ"

(так акрэслівае задачы камітэта БПСМ ГДУ яго сакратар Андрэй Гарбачоў)

**Пачаўся новы навучальны год. Зноў селі за парты студэнты. Працуе і універсітэцкі камітэт БПСМ (Беларускі патрыятычны саюз моладзі). У сувязі з гэтым і, канешне ж, тым, што дзейнасць гэтага камітэта мае самыя непасрэдныя адносіны да жыцця студэнцтва, да ўсяго універсітэта ў цэлым, ёсць неабходнасць крыху расказаць аб ім.**

Узначальвае камітэт БПСМ у ГДУ студэнт V курса гісторыка-юрыдычнага факультэта Андрэй Гарбачоў, які стаяў ля вытокаў стварэння гэтай арганізацыі. Яму я і вырашыла задаць пытанні, адказы на якія зацікавяць многіх студэнтаў універсітэта.

**-- Што ж уяўляе сабой БПСМ?**

-- Беларускі патрыятычны саюз моладзі -- гэта грамадская маладзёжная арганізацыя, якая з"яўляецца правадніком дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Яна была створана ў пачатку гэтага года. Датай яе нараджэння лічыцца 20-21 мая г.г., калі адбыўся Устаноўчы з"езд у г.Мінску.

**-- Якія мэты і задачы ставіць перад сабой ваша арганізацыя?**

-- Перш за ўсё мы пастараемся адрадзіць у моладзі пачуцці патрыятызму і любві да Радзімы, удзяліць увагу культурнаму, маральнаму і эстэтычнаму выхаванню моладзі.

**-- Што канкрэтна плануе зрабіць арганізацыя ва універсітэце і што ўжо зрабіла?**

-- Цяпер мы плануем правядзенне вялікай колькасці культурна-масавых мерапрыемстваў сумесна з культурным цэнтрам ГДУ, узнаўленне дзейнасці студэнцкіх будатрадаў, дзе юнакі і дзяўчаты змогуць адпачыць і зарабіць грошы (на дробныя расходы). У асноўным мы будзем адпраўляць атрады ў паўднёвым напрамку. У перспектыве мы плануем на працягу ўсяго навучальнага года забяспечваць другасную занятасць усіх зацікаўленых у ёй студэнтаў.

**-- Адкуль жа такія магчымасці?**

-- У ажыццяўленні нашых планаў нам будзе дапамагаць гарадскі камітэт БПСМ, а што датычыць другаснай занятасці, то мы заключылі дагавор з гарадской службай занятасці. Акрамя таго мы сумесна з выхаваўчым аддзелам нашага універсітэта збіраемся ўшчыльную заняцца паляпшэннем умоў пражывання і быту студэнтаў у інтэрнатах ГДУ. Трэба таксама дадаць, што ўсё тое, што датычыць нашай дзейнасці ў сценах універсітэта, поўнасцю падтрымліваецца адміністрацыяй ГДУ.

**-- Андрэй, скажы, навошта ж нашым студэнтам неабходна членства ў вашай арганізацыі, калі яны ўжо з"яўляюцца членамі прафсаюза, які абараняе іх інтарэсы?**

-- Перш за ўсё прафсаюз займаецца лёсам толькі сваіх членаў і выключна толькі па прафесійнай прыкмеце, " а наша арганізацыя займаецца абаронай і праблемай моладзі ў цэлым як сацыяльнай праслойкі грамадства.

**-- На якія сродкі вы плануеце ажыццяўляць планы?**

-- Цяпер станаўленне нашай арганізацыі падтрымліваецца і фінансуецца дзяржавай, але ў будучым БПСМ будзе самафінансуемым. Мы самі будзем зарабляць грошы для сваёй дзейнасці. І можаце мне паверыць, гэта будуць не толькі членскія ўзносы.

**-- Дарэчы, аб узносах. Што вы плануеце па гэтаму пытанню?**

-- Абавязковая ўплата ўзносаў будзе ўведзена з новага каляндарнага года. Па свайму памеру яны будуць чыста сімвалічнымі і не абцяжараць любога студэнта, незалежна ад памеру яго стыпендыі.

**-- Андрэй, да каго можна звяртацца за тлумачэннямі тых пытанняў, якія не ўдалося асвятліць у нашай размове? Напрыклад, як уступіць у вашу арганізацыю і інш?**

-- Па ўсіх пытаннях, звязаных з нашай арганізацыяй (а ў хуткім будучым і вашай), можна звяртацца непасрэдна да мяне (галоўны корпус, п. 4-10), або да сакратара пярвічнай арганізацыі на вашым факультэце. Так, на філалагічным факультэце -- гэта Алена Кастрыца (V курс), на матэматычным -- Ігар Блізнец (V курс), эканамічным -- Павел Серыкаў (III курс), геолага-геаграфічным -- Аксана Адамава (III курс), фізічным -- Андрэй Ходыраў (III курс), біялагічным -- Наталля Фінагенава (IV курс), гісторыка-юрыдычным -- Аляксандр Курдзесаў (V курс), факультэце фізічнай культуры -- Яўген Лібаў (II курс). Яны заўсёды могуць дапамагчы і адказаць на ўсе вашы пытанні, што датычаць БПСМ.

**-- Вашы планы на самую бліжэйшую будучыню?**

-- Плануем прыняць непасрэдны ўдзел у правядзенні ўрачыстасцей, прысвечаных юбілею нашага горада. Чакаем вас на пляцоўках і вуліцах горада ў дні (19-21 верасня) святкавання яго 855-годдзя і 200-годдзя палаца-паркавага ансамбля. Непасрэдна ва універсітэце мы ўдзельнічаем у падрыхтоўцы чарговага традыцыйнага конкурсау"Ану, першакурснік-97!".

***

Вось і яшчэ адна грамадская арганізацыя заявіла аб сабе і пасялілася ў нашым універсітэце. І мяркуючы па таму, як яна гэта зрабіла, -- гэта ўсур"ёз і надоўга. Што ж, пажадаем удачы яе першапраходцам, бо ім заўсёды нялёгка. Але ведайце, усіх, хто любіць папрацаваць, хоча даведацца, што такое сапраўдная студэнцкая дружба, цэніць добры гумар і вясёлы смех, усіх, хто хоча, каб студэнцкія гады запамяталіся яму надоўга, усіх, хто сумняецца, і ўпэўненых у сабе і ў заўтрашнім дні, усіх вас чакаюць тут вашы сябры і ваша будучыня.

**А.КАДОЛ,**
**студэнтка V курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.**



*Вести с практики*

# ОТКРЫТИЯ В АБАКУМАХ

Успешно завершилась археологическая практика студентов-историков. Совместными усилиями руководства университета, деканата историко-юридического факультета, кафедр всеобщей истории и истории Беларуси организован и материально обеспечен полноценный учебно-научный процесс, предусматривающий творческую работу первокурсников в полевых условиях археологической экспедиции.

Азы полевой археологии студенты осваивали близ д.Абакумы Лоевского района, где в живописном урочище Кордон, недалеко от места слияния Сожа с Днепром, расположен комплекс уникальных памятников древней и средневековой истории. Университетская экспедиция приехала сюда не случайно. Еще по свидетельствам одного из "первопроходцев" белорусского краеведения Е.Р.Романова, относящимся к самому началу века, близ малоизвестной гомельской деревушки Абакумы располагались курганы -- места захоронений наших далеких предков. Позднее, в 1920-х годах, известный белорусский исследователь К.М.Поликарпович обнаружил здесь следы стоянки человека каменного века. В 1960-х годах московский археолог Г.Ф.Соловьева раскопала здесь два кургана и сделала вывод, что жителями этого края более восьмисот лет назад были славяне, предположительно радимичи. Именно они, как показали наши исследования в Гомеле, основали этот город задолго до его первого летописного упоминания в 1142 г.

Пограничное положение современных Абакумов (на рубеже Беларуси и Украины) удивительно совпадает с древней, тысячелетней давности, границей радимичей (средневековых жителей Посожья), дреговичей (обитателей Белорусского Полесья), северян (населения Черниговщины) и полян (жителей Киевского Поднепровья). Эти славянские племенные объединения сыграли немалую роль в истории становления восточнославянской культуры и государственности, внесли значительный вклад в формирование белорусского, украинского и отчасти -- русского этносов. Разумеется, наша экспедиция преследовала не только учебные, но и сугубо научные цели. Надежды на открытия и находки полностью оправдались.

Раскопки показали, что местность в устье Сожа заселялась людьми неоднократно, начиная с эпохи позднекаменного века (неолита). Первопоселенцы обосновались здесь около 5-6 тысяч лет назад. Они, а также их преемники -- люди бронзового века -- оставили в земле многочисленные следы своего пребывания. Это разнообразные каменные орудия труда (ножи, скребки, резцы, проколки), а также обломки богато орнаментированной глиняной посуды. Первобытного человека, занимавшегося охотой, рыболовством, собирательством и начавшего осваивать земледелие и животноводство, влекло в устье Сожа обилие дикого зверя, рыбы, всевозможных даров местных лесов, пойменных лугов и озер. Племена бронзового века (4-3 тысячи лет назад) оставили здесь не только свои поселения, но и кладбища. В первом же изученном кургане экспедиция открыла древнее погребение, которое сопровождалось каменными орудиями, в т.ч. кремневым наконечником дротика. Редкой находкой является и обнаруженный на стоянке целый глиняный сосуд возрастом около трех с половиной тысяч лет.

В трех курганах экспедиция ГГУ им. Ф.Скорины открыла славянские погребения конца XI-XII веков. В двух из них похоронены женщины, в одном -- мужчина. Захоронения совершены в ямах, над которыми возведены песчаные насыпи. Кладбище относится к средневековой деревне, т.е. является крестьянским. Женщин хоронили в уборах, обязательной принадлежностью которых служили проволочные бронзовые украшения в виде колечек. Последние носились нашитыми на матерчатые ленты, свисавшие с головы и опускавшиеся на верхнюю часть груди. В качестве украшений использовались также металлические пуговки-бубенчики и стеклянные бусы. Интересной чертой похоронного ритуала являлось использование огня, что отражало древние представления о его очистительных свойствах, способностях отгонять враждебные человеку силы. В момент захоронения исполнялся комплекс чуждых христианству обрядов, предусматривавших ритуальное разбивание глиняных сосудов.

Исследование выявленных в курганах женских украшений позволило сделать вывод, что они принадлежали дреговичам. Следовательно, нами открыто одно из самых восточных дреговичских поселений. А некоторые особенности погребального обряда показывают наличие в нем радимичских и, возможно, северянских черт.

В средневековье через местность Абакумы (как она именовалась 800-1000 лет назад мы не знаем) проходила дорога, связывавшая "мать городов русских" Киев, дреговичское Полесье с радимичским краем и шедшая через окрестности Лоева по правому берегу Сожа мимо современных Карповки, Шарпиловки, Старых Дятловичей на летописный Гомель.

В урочище Кордон нами открыты и следы позднейшего пребывания людей, относящиеся к XVII-XVIII векам. В то время неподалеку проходили рубежи Речи Посполитой и Московского (Российского) государств. Совсем рядом располагался не раз переходивший из рук в руки Лоевский замок, под стенами которого в середине XVII столетия состоялись две невиданные по ожесточению, кровопролитные битвы между королевско-шляхетскими войсками Речи Посполитой и казацкими отрядами Богдана Хмельницкого. По-видимому, на Кордоне размещалась порубежная застава. Ее стражники оставили в земле следы построек, россыпи черепков гончарной и стеклянной посуды, битый кирпич, печные изразцы, подковки.

Студенты стали первооткрывателями малоизученных страниц нашей многовековой истории. Поэтому они трудились на раскопках с большим энтузиазмом. Трудно назвать всех увлеченных и старательных. Но мы не ошибемся, если отметим А.Пастушенко, В.Цацарина, В.Бобровничего, А.Моисеенко, П.Руденка, А.Малашкова, Ю.Быкову, Н.Пунтус, А.Мартян, Д.Мельникова, Е.Писаренко, Н.Богдашеву, Е.Шипшу, Н.Безвершенко, Е.Горленко, Т.Гафинец, Е.Малашенко. Немалую роль в успехе экспедиционных работ сыграла правильная организация полевого быта. И здесь оказалась весьма кстати изобретательность шеф-повара А.Шумского и завхоза А.Малкова.

Самые добрые слова хочется сказать о гостеприимных жителях д.Абакумы. Всестороннюю помощь экспедиции оказали директор совхоза "Карповский" Николай Михайлович Воронко, главный агроном хозяйства Григорий Михайлович Астровик, лесничий Первомайского лесничества Игорь Васильевич Борисов, мастер Галина Алексеевна Астровик, председатель Шарпиловского сельсовета Виктор Иванович Горленко. Безопасность работы студентов обеспечили работники Лоевского райотдела милиции.

Новые научные открытия будут положены в основу продолжения исследований и учебных студенческих разработок в области средневековой белорусской истории, а находки пополнят экспозицию и фонды Археологического музея кафедры всеобщей истории университета.

**О.МАКУШНИКОВ,**
**к.и.н., доцент кафедры всеобщей истории,**
**В.СЫЧЁВ,**
**ассистент кафедры истории Беларуси.**

# КАЛІ КВІТНЕЕ СКАУЦКАЯ ЛІЛЕЯ

Кожны год, пачынаючы з 1991г., на тэрыторыі цудоўнага аздараўленчага лагера "Юны хімік" з 1 па 10 жніўня размяшчаецца палатачны лагер Гомельскай абласной арганізацыі адкрытага скаутызму (ГААС). Тут збіраюцца хлопчыкі і дзяўчынкі -- юныя скауты, каб сустрэцца са старымі сябрамі і набыць новых, падзяліцца ведамі і вопытам, атрыманымі за год, і проста весела правесці час, расказваючы дзіўныя гісторыі і распяваючы любімыя песні каля начнога кастра. Былі сярод іх і студэнты нашага універсітэта, а калі дакладней, сімпатычныя і вясёлыя дзяўчаты -- Тамара Паплаўская, Таццяна Філонава, Ірына Геркусава, Ірына Канавалава, аўтар гэтага артыкула, якія прадстаў-ляюць філалагічны, фізічны і эканамічны факультэты і на чыю дапамогу заўсёды маглі разлічваць малодшыя рабяты.

Нягледзячы на суровае выпрабаванне, якім вырашыла праверыць рабят на стойкасць матухна-прырода, надзяліўшы праліўнымі дажджамі ў першыя дні лагера, усе з радасцю акунуліся ў дзіўнае жыццё "казачнага лесу", бо менавіта так называўся лагер у гэтым годзе. Захапляльныя паходы, водны пераход, малыя алімпійскія гульні, ачыстка лесу і ўладкаванне лагера,заняткі па скауцкіх спецыяльнасцях -- гэта было днём. Пасля ж заходу сонца, калі на небе загараліся зоркі і наступала цішыня, рабят чакалі цікавыя і поўныя на нечаканасці гульні ў лесе, песні і фантастычныя расказы каля кастра і, безумоўна, начныя дзяжурствы, якія таксама не абыходзіліся без сюрпрызаў і прыгод. Не абыходзілася, як і ў любой казцы, без злых разбойнікаў (рабят з суседніх лагераў), якія раз-пораз беспаспяхова наладжвалі падкопы юным жыхарам "казачнага лесу". Як і ў казках, была ў лагеры і свая добрая фея -- Галіна Паўлаўна Барадзіна, старшы скаут-майстар і выкладчыца нашага універсітэта, якая ў любы момант магла даць неабходную параду і падтрымаць у складаным становішчы.

Не былі абдзелены ўвагай і дзеці з "Юнага хіміка": ім паказвалі выдатныя музычныя пастаноўкі пад адкрытым небам, казкі "Брэменскія музыканты" з яе працягам "Па слядах брэменскіх музыкантаў".Выступалі рабяты і на канцэртах самога аздараўленчага лагера.

Аднак, як пяецца ў вядомай бардаўскай песні "Милая моя", "всем нашим встречам разлуки, увы, суждены..." Скончылася і гэта казка: быў спушчаны скауцкі флаг, які горда развяваўся над лагерам усе дзесяць дзён, былі зняты палаткі і затушаны скауцкі касцёр. Але ў рабят надоўга захаваюцца цудоўныя ўспаміны, і яны ўжо зараз спадзяюцца на новыя сустрэчы і прыгоды, якія чакаюць іх і пасля закрыцця лагера, бо скауцкае жыццё б'е ключом увесь год.

**ВОЛЬГА АГАПІТАВА,**
**студэнтка гр. Б-31**
**філалагічнага факультэта.**



*ГДУ імя Ф.Скарыны мае слаўныя літаратурныя традыцыі. Дастаткова згадаць, што ў сценах галоўнай навучальнай установы Палесся вучыліся І.Шамякін, М.Даніленка, А.Жаўрук, М.Сурначоў, Л.Гаўрылаў, К.Кірэенка. Маладое пакаленне нашых выпускнікоў і цяпер сярод лідэраў сучаснай беларускай літаратуры. Успомнім імёны арыгінальнага ў жыцці і творчасці А.Сыса, барда Э.Акуліна, крытыка-публіцыста А.Бяляцкага, празаіка-містыка А.Казлова і адчуем гонар за гомельскую школу ў беларускім пісьменстве. Да слаўнай кагорты вышэйзгаданых аўтараў належыць і Ларыса Раманава, выпускніца 1991 года, якая зусім нядаўна выпусціла першы паэтычны зборнік "Аддай асалоду Богу", што адразу стаў прыкметнай з'явай у нашым культурным жыцці. Зразумела, што мы не маглі абмінуць гэтай падзеі. І таму вырашылі арганізаваць прэзентацыю кнігі. Анонс будучага свята робіць студэнтка III курса філалагічнага факультэта Аксана ТУСІКАВА.*

# СПАДЗЯВАЦЦА РАЗАМ

Кожны дзень, што нараджаецца на гэтай зямлі, даруе нам свет, цеплыню, шчасце. І кожны адчувае пэўную асалоду: жыцця, пачуццяў, учынкаў. І ёсць людзі, якія шануюць тое, што падаравана ім кожным новым днём, якія адчуваюць, што павінны аддаць тую асалоду Богу.

Нарадзілася Ларыса ў 1968 г. у в.Покаць Чачэрскага раёна. Жылі ў пасёлку Карма, дзе і адчула яна нейкае імкненне да "сваёй зямлі" (так яна скажа потым пра родныя мясціны), да сіне-фіялетавага неба перад захадам сонца, да паху кветак, што раслі каля дома. Сям'я Ларысы апошняй пакідала Карму; пераехалі жыць у Покаць. Незабыўнай чорнай плямай на сэрцы застаўся толькі ўспамін пра бульдозеры, якія раўнялі ўвесну квітнеючую вуліцу засумаваўшай без людзей Кармы.

Першы верш Ларыса напісала ў 13 год. Атрымалася добра, і прыйшло нейкае разуменне таго, што пісаць трэба і варта. Падчас вучобы ва універсітэце не спыняла сваю творчую дзейнасць. З'явіліся яе кароткія апавяданні ў часопісе "Маладосць", а адзін з нарысаў надрукавала раённая газета "Чачэрскі веснік". Вершы Ларысы друкаваліся ў альманаху "Тутэйшыя", у выданнях "Наша ніва", "Аксамітны жах", "Атава", "Маладосць", "Крыніца", "Першацвет". Паступова з'явілася жаданне выдаць вершы асобным зборнікам. Гэтая справа аказалася даволі складанай, але, "калі чагосьці вельмі хочаш, яно заўсёды збываецца", -- гэтыя словы Ларысы сталі своеасаблівым дэвізам яе жыцця.

І вось кніга выйшла. "Прайсці, спазнаць, зведаць свет жывога і мёртвага, каб толькі назад вярнуцца, дзе ўсё зразумела і проста" -- асноўны матыў вершаў Ларысы Раманавай, -- зазначана ў пастскрыптуме да кнігі. А рэдактар яе, Л.В.Дранько-Майсюк, у сваёй рэцэнзіі заўважыў, што Ларыса не піша, а быццам выдыхае свае вершы. І яны сапраўды падобны на лёгкі ўздых, што бесклапотна злятае з яе вуснаў. Але ў іх шмат упартасці і моцы. Прачытаць хаця б радкі, што абрала паэтка як сваё крэда:

***Спазнаўшы непатрэбнасць усіх***
***сваіх надзей,***
***так хочацца ўсё ж ісці,***
***І я іду далей --***
***туды, дзе ўжо няма нічога,***
***дзе ў рэшце рэшт знікае і дарога...***

Выданне кнігі стала сапраўднай падзеяй у жыцці не толькі Ларысы, але і яе сяброў, знаёмых. Каб падтрымаць маладую таленавітую паэтку, каб паказаць, што ў наш цяжкі час прыгажосць і творчасць усё ж патрэбныя, мы збіраемся арганізаваць прэзентацыю. Ёсць усе падставы, што гэтая невялікая імпрэза ператворыцца ў сапраўднае свята -- свята паэзіі.

Як казалі ў старажытнасці: "Цудоўнае -- побач". Вось і жыве побач з намі такая цудоўная жанчына, пяшчотная маці і надзейная сяброўка. Працуе навуковым супрацоўнікам у Веткаўскім музеі народнай творчасці, шануе мінулае, збірае фальклор, піша вершы. Дзякуй Вам, Ларыса, за Вашу кнігу, за Вашу цудоўную мову, цёплую душу. Я спадзяюся, што гэтая кніга -- толькі пачатак, як кажуць, першы крок на Вашым творчым шляху. Дык давайце спадзявацца разам.

**Прэзентацыя адбудзецца 25 верасня на філфаку. Чакаем усіх аматараў паэтычнага слова.**



# ЗВАНОК, ДЫ НЕ ЗУСІМ ЗВЫЧАЙНЫ...

З 1-га верасня ажылі, напоўніліся студэнцкімі галасамі вучэбныя карпусы. Універсітэт зноў -- у прывычным рабочым рытме. А будучыя фізікі, якія займаюцца ў корпусе N5, не змаглі не заўважыць прыкметную навінку: цяпер з дакладнасцю да хвіліны кліча іх на заняткі, перапынкі голас званка. Многія, напэўна, усміхнуцца: маўляў, гэта ж абавязковы атрыбут усюды, дзе праводзяцца заняткі -- ці то школа, ці то ВНУ. Аднак у гэтай, на першы погляд звычайнай, будзённай з"яве ёсць адна асаблівасць -- сама мадэль званка. Гэта -- аўтаматычнае прыстасаванне, асновай якога з"яўляецца электронны гадзіннік з упраўленнем на мікрасхемах. Яна запраграміравана ў часе, і званкі раздаюцца ў патрэбныя гадзіны і хвіліны без дапамогі вахцёра, як гэта робіцца ў іншых вучэбных карпусах, акрамя галоўнага. Трэба нагадаць, што менавіта ў апошнім яшчэ дзесяць гадоў назад упершыню было ўстаноўлена такое прыстасаванне, вопыт эксплуатацыі якога паказаў яго высокую надзейнасць. Цяпер яно крыху мадэрнізавана, што яшчэ больш павысіць яго якасць.

Як і дзесяць гадоў назад, аўтарам і выканаўцам гэтай ідэі быў А.М.Дземідзенка, тады яшчэ студэнт эканамічнага факультэта, а цяпер загадчык кафедры АСАІ, дацэнт. Зараз дапамагаў яму ў рэалізацыі праекта дацэнт гэтай жа кафедры М.К.Яфімчык.

**(Наш. кар.)**

*Пророки и пророчества*

# РЕАЛЬНОСТЬ ИЛИ ФАНТАЗИЯ?

14 декабря 1503 года в состоятельной еврейской семье на юге Франции родился Мишель Нострадамус. Он получил превосходное по тем временам университетское образование: изучал греческий и латынь, философию и медицину. В медицине он особенно преуспел. Молодой Нострадамус прославился успехами в борьбе с неизлечимой тогда холерой. В лечении он прибегал к простым вещам: чистой воде и элементарной гигиене, к которой Европа не была приучена. Правда, двоих своих сыновей он не сумел уберечь от холеры. Нострадамус женился во второй раз на молодой вдове, и та родила ему восьмерых детей.

Еще в молодости Нострадамус увлекся таинственной наукой -- кабалистикой, которой обучал его дед по материнской линии. Эта наука, особенно распространенная среди еврейской общины, якобы позволяет общаться с духами. Позднее Нострадамус забросил медицину и занялся алхимией и астрологией. По положению небесных тел и в соответствии со своей интуицией он принялся предсказывать будущее. Молва о его пророчествах распространилась по всей Франции. Их он рифмовал в четверостишия и издал отдельной книгой в 1556 году. Книгу он назвал "Столетия и пророчества".

Когда до королевы Екатерины Медичи дошел слух о том, что Нострадамус предрек ужасную смерть ее мужу Генриху II, она призвала его во дворец. Он был возведен в ранг личного врача короля. Тем не менее Генрих II, как и предсказал прорицатель, умер от жестоких ран, которые он получил на рыцарском турнире. Позже Нострадамусу был пожалован почетный титул "врача и советника" нового короля Франции, сына Екатерины Медичи Карла IX.

Утром 2 июня 1566 года бездыханного Нострадамуса нашли лежащим на полу между кроватью и креслом. Он в точности предсказал день и час своей смерти. Его вдова Анна выбила на двухметровой мраморной доске, которую установили на могиле, следующие слова: "Здесь покоятся кости знаменитого Мишеля Нострадамуса. Он прожил 62 года, 6 месяцев и 17 дней. Умер в Салоне в 1566 году. Пусть потомки не беспокоят его отдыха".

Но потомки не послушались разумного совета. Они принялись читать и перечитывать "Столетия и предсказания" Нострадамуса, интерпретируя их на свой лад. Рифмованные четверостишия оказались сложными для понимания. Считается, что многие из них таят в себе "зашифрованные послания", которые не прочесть без ключа. В них Нострадамус отсылает читателя к звездам и кометам, от положения которых на небесном теле якобы зависит будущее. При желании в этих философско-астрологических опусах каждый может найти то, что ему заблагорассудится. Например, его слова о том, что до начала "конфликта" -- то есть мировой войны в 1999 году -- "упадет большая стена", сегодня интерпретируются как предсказание падения ... Берлинской стены. Есть у Нострадамуса и упоминание об огромном пожаре "в очень сухом месте", жару от которого разнесет по свету ветер. Произойдет это событие, когда комета окажется на равном расстоянии между Марсом и Сатурном. В этом усмотрели пророчество аварии на Чернобыльской АЭС. Утверждение Нострадамуса о гибели двух городов, которые будут разрушены в результате "двух невидимых бедствий", современные толкователи восприняли как предсказание разрушения Хиросимы и Нагасаки двумя атомными бомбами. Усердствуя в разгадке четверостиший, некоторые толкователи утверждают, что Нострадамус предусмотрел даже распад Югославии, боснийский кризис, восстание в Венгрии 1956 года и другие события недавней истории. К числу "попаданий" относят утверждение предсказателя о гибели французкой монархии в 1792 году.

В городе Салон-де-Проване сохранился дом, в котором прожил последние два десятка лет Мишель Нострадамус. Ныне он превращен в музей. В нем сохранилось немало подлинных вещей и письменных оригиналов. В их числе -- завещание предсказателя, составленное им за 2 недели до смерти, письма к нему его любимого сына Цезаря, издание "Столетия и пресказания" 1697 года. Эти и другие документы скрупулезно изучают ученые, которые пытаются понять, может ли человек действительно заглянуть в будущее или все пророчества -- не более чем фантазия.

**С.ЖАГОРОВ,**
ст. преподаватель кафедры теории и истории государства и права.

## АД ГОМЕЛЯ ДА АНАПЫ
*(Пралеглі маршруты студэнцкай практыкі)*

Лета для студэнтаў -- гэта не толькі хвалюючы гарачы час экзаменацыйнай сесіі. Звычайна пасля яе ў іх пачынаецца этап не менш важны і адказны -- вучэбная практыка. Яна прыносіць юнакам і дзяўчатам шмат адкрыццяў і ўражанняў, якія надоўга потым застаюцца ў памяці. А звязаны яны, у прыватнасці, у будучых педагогаў з работай у аздараўленчых дзіцячых лагерах, дзе яны працуюць выхавацелямі.

Мінулым летам групе студэнтаў-трэцякурснікаў, якія набываюць педагагічныя спецыяльнасці, можна сказаць, пашанцавала: прадставілася магчымасць паехаць на практыку на ўзбярэжжа Чорнага мора -- у Анапу. Дзіцячаму санаторыю на час летніх заездаў патрэбны былі выхавацелі.

Нашы студэнты імкнуліся рабіць усё для таго, каб хлопчыкі і дзяўчынкі адпачылі з карысцю, весела і змястоўна. Так на справе і атрымалася. Гэта пацвярджаюць ніжэйпрыведзеныя радкі. На адрас нашага універсітэта з санаторыя "Анапа" прыйшло пісьмо, у якім гаворыцца: "Адміністрацыя санаторыя выказвае падзяку студэнтам Ігару Каморнікаву, Юрыю Камарову, Надзеі Аўсяннікавай, Вользе Каленчыц, Тамары Запатылак, Валерыі Чапленка, Інэсе Шкаберавай, Алене Дудко, Генадзю Станкевічу, Аляксандру Варановічу, Аляксандру Яроўскаму за добрасумленную працу. За час работы з 29 мая па 29 жніўня яны праявілі сябе творчымі, ініцыятыўнымі асобамі, якія любяць сваю працу, з адказнасцю адносяцца да любой дaручанай справы. У калектыве санаторыя яны карысталіся павагай".

Як кажуць, па працы і пашана. Дададзім толькі, што студэнты ГДУ, якім выказана ўдзячнасць і падзяка, вучацца на фізічным, геолага-геаграфічным факультэтах, факультэце фізічнага выхавання, на матфаку.

**(Наш кар.)**



*19-21 верасня ў нашым горадзе пройдуць масавыя ўрачыстасці з нагоды 200-годдзя палаца-паркавага ансамбля і 855-годдзя з першага летапіснага ўпамінання Гомеля.*

*На здымку: адна з цудоўных мясцін парку.*
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

**Спорт**

## З ГАНАРОВЫМ ВЫСОКІМ ЗВАННЕМ!

Групе вядучых беларускіх спартсменаў за выдатныя спартыўныя дасягненні прысвоена званне "Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь". Яго ўдастоена і студэнтка чацвёртага курса факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта сярэбраны прызёр летніх Алімпійскіх гульняў у Атланце па сямібор'ю Наталля Сазановіч.

## І РЭКОРД, І МЕДАЛЬ

У шведскім горадзе Гётэборг адбыўся чэмпіянат Еўропы па сілавому трохбор'ю. На гэтых спаборніцтвах выдатна выступіў другакурснік факультэта фізічнай культуры Уладзімір Гадуноў (вагавая катэгорыя да 60 кг.). Асабліва вызначыўся ён у жыме лежачы. У гэтым практыкаванні Уладзімір зафіксаваў 160 кг і ўстанавіў рэкорд нашай краіны.

Спаборніцтвы У.Гадуноў закончыў з другой сумай і стаў сярэбраным прызёрам еўрапейскага чэмпіянату. Да таго ж ён выканаў нарматыў майстра спорту міжнароднага класа Рэспублікі Беларусь. Гэты поспех малады асілак падзяляе са сваім трэнерам -- ст. выкладчыкам кафедры фізічнай культуры і спорту У.А.Галавачом.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
- -- гісторыі Беларусі -- асістэнта;
- -- хіміі -- асістэнта (2);
- -- лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту -- ст.выкладчыка;
- -- фізвыхавання і спорту -- дацэнта (2), ст. выкладчыка;
- -- камерцыйнай дзейнасці і фінансаў -- ст. выкладчыка;
- -- эканамічных тэорый -- ст.выкладчыка;
- -- геаграфіі -- дацэнта;
- -- рускай літаратуры -- дацэнта;
- -- матэматычных праблем кіравання -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў факультэта фізічнага выхавання выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры **КОШМАНУ** Міхаілу Рыгоравічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымліваліся даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паліградрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 340
Падпісана да друку 11.09.97.